УДК 316.74

Студ. У.Р. Клепчукова
Навук. кір. дац. В.У. Коваль
(кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі, БДТУ)

# АСАБЛІВАСЦІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Беларускія музейныя супрацоўнікі за гады незалежнасці дасягнулі значных поспехаў у фарміраванні ўнікальных калекцый і экспазіцый. Развіццё музейнай справы працягвае развівацца ў адпаведнасці з сусветнымі тэндэнцыямі. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі паўплывалі на змены музейных экспазіцый: з'явіліся новыя віды музеяў, новыя формы работы з экспанатамі, інтэрактыўныя віды ўзамааносін наведвальнікаў і навуковых супрацоўнікаў.

Першыя музейныя калекцыі збіраліся ў рэзідэнцыях буйных феадалаў, у манастырах, брацтвах і храмах. Другая сусветная вайна пакінула значны след у музейнай справе Беларусі, прычыніўшы непапраўныя страты шматлікім калекцыям. У сучаснай сістэме Міністэрства культуры дзейнічае каля 160 дзяржаўных музеяў, фонд якіх налічваюць больш за 3 млн экспанатаў.

У зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь знаходзіцца самая шматлікая музейная калекцыя ў Беларусі – гэта больш за 500 тысяч адзінак захоўвання: унікальная калекцыя скарбаў з розных куткоў Беларусі, каштоўныя дакументы, старадрукі, слуцкія паясы, калекцыя музычных інструментаў і зброі, каштоўны фарфоравы посуд і многае іншае. У структуру Нацыянальнага гістарычнага музея таксама ўваходзяць 5 філіялаў, дзейнасць якіх адлюстроўвае развіццё беларускага грамадства ў самых розных аспектах культуры.

Адным з самых значных музеяў нашай краіны стаў Беларускі Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Музейная калекцыя ўяўляе сабой адну з самых маштабных экспазіцый, прысвечаных ваеннай тэме. Ён быў адчынены ў 1944 г. яшчэ у перыяд Другой сусветнай вайны. Экспанаты музею былі перададзены Беларускім штабам партызанскага руху, Галоўным упраўленнем трафейнага ўзбраення Чырвонай Арміі, ваеннымі фотакарэспандэнтамі і непасрэднымі ўдзельнікамі баявых дзеянняў. Агульная колькасць экспанатаў складае больш за 154 тысячы адзінак.

Музейная дзейнасць Беларусі мае значную перспектыву, яна пашырае звесткі пра нацыянальную культуру і гісторыю. Стварэнне новых музеяў і пашырэнне існуючых калекцый – запатрабаваная практыка па ўшанаванню беларускай культурнай спадчыны.